# ГАЗЕТА «ЗВЯЗДА»: ТЭМАТЫЧНЫЯ І ЖАНРАВЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ

**_В. І. Канюта_**

*Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом “Звязда”»,*
*вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*veronika_kanyuta@mail.ru*

*Навуковы кіраўнік – Т. У. Падаляк,*
*доктар філалагічных навук, дацэнт*

Развіццё з улікам сучасных трэндаў журналістыкі і ў адпаведнасці з прыярытэтамі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі дазваляе друкаваным СМІ захоўваць устойлівыя пазіцыі на медыярынку Рэспублікі Беларусь. Адлюстроўваючы падзеі і працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве, газеты і часопісы становяцца ўнікальнай факталагічнай крыніцай інфармацыі, дакументам эпохі.

**_Ключавыя словы:_** журналістыка; сродкі масавай інфармацыі; газета «Звязда»; тэматыка; жанры.

# ГАЗЕТА «ЗВЯЗДА»: ТЕМАТИЧЕСКИЕ И ЖАНРОВЫЕ ПРИОРИТЕТЫ

**_В. И. Канюта_**

*Редакционно-издательское учреждение*
*«Издательский дом “Звязда”»,*
*ул. Б. Хмельницкого, 10А, 220013, г. Минск, Республика Беларусь,*
*veronika_kanyuta@mail.ru*

*Научный руководитель – Т. В. Подоляк,*
*доктор филологических наук, доцент*

Развитие с учетом современных трендов журналистики и в соответствии с приоритетами государственной информационной политики позволяет печатным СМИ сохранять устойчивые позиции на медиарынке Республики Беларусь. Отражая события и процессы, происходящие в обществе, газеты и журналы становятся уникальным фактологическим источником информации, документом эпохи.

**_Ключевые слова:_** журналистика; средства массовой информации; газета «Звязда»; тематика; жанры.

Аптымізацыя рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі, масавы пераход аўдыторыі на электронныя інфармацыйныя пляцоўкі абумовілі трансфармацыю перыядычнасці як рэспубліканскіх, так і рэгіянальных нацыянальных друкаваных СМІ. Па стане на чэрвень 2025 г., інфармацыйнае поле Рэспублікі Беларусь прадстаўлена трыма штоддзёнными рэспубліканскімі нацыянальнымі газетамі – «Звяздой», «СБ. Беларусь сегодня» і «Рэспублікай».

Масавы пераход ад штодзённага да штотыднёвага фармату выхаду станоўча адлюстраваўся на эканамічных паказчыках рэдакцый: скараціліся выдаткі на тыпаграфскія і паштовыя паслугі, аптымізаваўся кадравы састаў. Кантэнт друкаваных СМІ ў сучасных умовах адрозніваецца пераважным аналітычным складнікам, вызначаецца высокай экспертнай прадстаўленасцю, прысутнасцю аўтарскай журналістыкі, адраснасцю. Як адзначае даследчыца Л. Белякова, «высокаякасная інфармацыйная прадукцыя ва ўсе часы карысталася попытам у публікі і заўсёды будзе дзейснай, бо грамадства зацікаўлена ў тым, каб складаныя пытанні сучаснасці вырашаліся эфектыўна і хутка, што немагчыма без надання ім галоснасці, калектыўнага асэнсавання і абмеркавання інавацыйных ідэй у сучаснай прэсе» [1, с. 346].

Такой пазіцыі прытрымліваецца і газета «Звязда»: адпавядае айчынным тэндэнцыям функцыянавання друкаваных сродкаў масавай інфармацыі на сучасным этапе, захоўвае традыцыі класічнай журналістыкі. Укараняючы ў рэдакцыйную дзейнасць актуальныя навацыі, журналісты выдання не злоўжываюць трэндамі. Газета арыентуецца на пастаяннага чытача, імкнецца задаволіць яго тэматычныя запыты, жанравыя перавагі, адпавядае заяўленым фармату і візуальнаму афармленню.

Газета «Звязда» выходзіць з аўторка па суботу ўключна. У залежнасці ад інфармацыйнай нагоды (як правіла, значныя грамадска-палітычныя падзеі: выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, адзіны дзень галасавання, рэферэндум і інш.), прадугледжаны выхад і ў нядзелю, і ў панядзелак. Фармат выдання – А2 і А3. Часцей аддаецца перавага апошняму. Фармат А2 у асноўным выкарыстоўваецца пры падрыхтоўцы спецыяльных тэматычных і рэкламных выпускаў. Тыраж беларускамоўнага выдання па стане на 27 чэрвеня 2025 г. – 11 061 экзэмпляр.

Сфарміравана структурна-кампазіцыйная мадэль напаўнення газеты. Першая паласа ўтрымлівае лагатып выдання, пачатак публікацыі аб мерапрыемстве (мерапрыемствах) з удзелам кіраўніка дзяржавы, цэн-

тральнае фота (з загалоўкам і подпісам да яго), анонс дзвюх найбольш вартых увагі публікацый нумара, пачатак адной-дзвюх публікацый нумара, працяг якіх змяшчаецца на іншых старонках газеты. На апошняй паласе друкуецца інфармацыя з месяцовага календара, актуальны прагноз надвор'я. Традыцыйнай для заключнай старонкі з'яўляецца рубрыка «Даты. Падзеі. Людзі», друкуюцца цытаты вядомых людзей. Іншыя старонкі перыядычнага выдання фарміруюцца па тэматычна-жанравым прынцыпе. Калі ў пачатку газеты пераважае грамадска-палітычная і эканамічная праблематыка, якая падаецца ў інфармацыйных жанравых формах, то астатнія палосы запаўняюцца публікацыямі сацыяльнага, адукацыйнага, культурнага, спартыўнага, іншага профілю. Журналісты рэгулярна асвятляюць пытанні, якія ляжаць у плоскасці сфер бяспекі, аховы здароўя, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, транспарту. У адлюстраванні гэтай праблематыкі аддаецца перавага аналітычным жанравым формам.

Даследчыца Л. Саянкова-Мяльніцкая ўказвае на такую тэндэнцыю друкаваных СМІ, як змяшчэнне рэдакцыйнай увагі ў бок палітычнага дыскурсу. Яна адзначае, што «змяшчэнне рэдакцыйных інтарэсаў у бок палітычнага дыскурсу, якое агаліла прапагандысцкія мэты, мэтамеркаванне сучасных журналістаў, змяніла ўяўленні аб этычных правілах» [2, с. 33]. У меншай ступені гэта закранула газету «Звязда». Палітычная тэма падаецца журналістамі выдання ў якасці канстатацыі падзеі, якая адбылася, без асабістых інтэрпрэтацый і ацэнак. Карэспандэнтамі асвятляецца дзейнасць Прэзідэнта, спікераў абедзвюх палат парламента, яны прысутнічаюць на пасяджэннях сесій Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў, ключавых мерапрыемствах з удзелам Прэм'ер-міністра, кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, іншых вышэйшых службовых асоб краіны.

Сучасны чытач стаў больш патрабавальны да інфармацыі: адкрываючы газету, ён прагне не забаўляльнага кантэнту, а праўдзівай інфармацыі аб падзеях унутры краіны і па-за яе межамі. Як слушна заўважае дэкан факультэта журналістыкі БДУ А. Бяляеў, «з-за праблем знешнепалітычнага характару, глабальных эканамічных і палітычных узрушэнняў мы бачым запыт на палітычную інфармацыю, інфармацыю аб стане эканомікі. І гэта не часовая цікавасць – людзі адчуваюць пульс жыцця» [3]. Своечасова даючы аб'ектыўную, зразумелую інфармацыю палітычнай і эканамічнай скіраванасці, штодзённыя перыядычныя

выданні, у тым ліку «Звязда», трымаюць ўвагу аўдыторыі, захоўваюць імідж кампетэнтнага СМІ, якому можна давяраць.

З улікам сучасных патрабаванняў і магчымасцей газета абнавіла не толькі тэматычную, а і жанравую палітру. Жанравая палітра – гэта ўжо не толькі класічная сістэма, прадстаўленая інфармацыйнымі, аналітычнымі і мастацка-публіцыстычнымі тэкставымі формамі зносін з чытачом. Пры падрыхтоўцы публікацый адбываецца сінтэз жанраў, размываюцца іх граніцы, з’яўляюцца новыя формы раскрыцця тэмы. Як адзначае расійскі даследчык А. Цяртычны, «падобныя змены выкліканы неабходнасцю “адаптацыі” жанраў да новых камунікатыўных сітуацый, якія абумоўлены змяненнем ролі журналіста ў грамадстве» [4, с. 49]. Сучасны журналіст з’яўляецца лідарам грамадскай думкі, і ад таго, якую форму ён выбірае для трансляцыі інфармацыі, залежыць яе ўспрыняцце аўдыторыяй. Трансфармацыя жанравай сістэмы ўзбагачае фактуру, аблягчае працу журналіста, які, перадаючы сваю думку, не абмяжоўваецца патрабаваннямі, абумоўленымі жанравай спецыфікай.

Шырокая тэматычная палітра, увасобленая ў традыцыйных і сінтэзаваных жанравых формах, вылучае ў медыяасяроддзі «Звязду» як класічны прыклад штодзённай газеты. Сярод інфармацыйных пераважаюць заметка, рэпартаж, інтэрв’ю. Распрацоўваючы тэму ў аналітычных жанрах, аўтары аддаюць перавагу агляду, артыкулу і карэспандэнцыі. Мастацка-публіцыстычныя жанры ў газеце, як правіла, прадстаўлены нарысам. Сінтэзуючы жанравыя формы, журналісты часцей за ўсё выкарыстоўваюць рэпартаж і інтэрв’ю, рэпартаж і нарыс, іншыя жанравыя камбінацыі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Белякова Л. П.* Аналитическая журналистика – стимул к апробации инновационных идей // Журналистика в 2009 году: Трансформация систем СМИ в современном мире : сборник материалов Междунар. науч.-практ. конф. М.: Факультет журналистики МГУ имени М. В. Ломоносова, 2010. С. 345–346.
2. *Саенкова-Мельницкая Л. П.* Профессиональная идеология современной белорусской журналистики: процессы трансформации // Журналистика XXI века. Возвращаясь к профессиональной идеологии : сборник материалов Междунар. науч.-практ. конф., 18–19 ноября 2022 г. Санкт-Петербург: Медиапапир, 2022. С. 31–34.
3. *Канюта В.* «Журналіст – прафесія, якая патрабуе служэння» // Звязда. 2024. 6 ліп. С. 7.
4. *Тертычный А. А.* Жанры периодической печати: учеб. пособие М.: Аспект Пресс, 2000. 312 с.